ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.06.2025 № 103

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце»
# для I класа ўстаноў адукацыі,
# якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы
# агульнай сярэдняй адукацыі,
# з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 180 гадзін (6 гадзін на тыдзень).

На ўрокі навучання чытанню выдзяляюцца вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі на вывучэнне вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура», – 90 гадзін (3 гадзіны на тыдзень).

На ўрокі навучання пісьму выдзяляюцца вучэбныя гадзіны, прадугледжаныя тыпавым вучэбным планам агульнай сярэдняй адукацыі на вывучэнне вучэбнага прадмета «Беларуская мова», – 90 гадзін (3 гадзіны на тыдзень).

Урокі навучання грамаце могуць быць камбінаванымі: на адным і тым жа ўроку педагагічны работнік можа вучыць як чытанню, так і пісьму.

3. Мэта навучання грамаце – фарміраванне базавых ведаў, уменняў і навыкаў чытання і пісьма, агульнавучэбных уменняў, навыкаў і спосабаў дзеянняў; развіццё асноўных відаў вуснага і пісьмовага маўлення, пазнавальнага інтарэсу; выхаванне маральна-этычных якасцей, эмацыянальна-каштоўнасных адносін да навакольнай рэчаіснасці, культуры зносін. Пры гэтым веды, уменні і навыкі разглядаюцца як сродак паўнавартаснага развіцця асобы навучэнца.

4. Асноўнымі задачамі навучання грамаце выступаюць:

развіццё фанематычнага слыху (уменне распазнаваць і вылучаць асобныя гукі ў слове і складзе, вызначаць іх паслядоўнасць);

фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў беларускай мовы, засваенне літар беларускага алфавіта і развіццё ўмення суадносіць іх з адпаведнымі гукамі;

навучанне першапачатковаму чытанню і пісьму;

развіццё цікавасці да чытання як сродку пазнання, фарміраванне чытацкага кругагляду, уменняў працы з рознымі крыніцамі інфармацыі;

узбагачэнне слоўнікавага запасу;

развіццё звязнага вуснага маўлення;

фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці.

5. Асноўнай формай правядзення вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце» з’яўляецца ўрок. Для ўрока навучання грамаце характэрна перавага калектыўных форм арганізацыі вучэбнай

дзейнасці навучэнцаў у спалучэнні з рознымі формамі дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу. У залежнасці ад задач кожнага этапу ўрока выкарыстоўваецца калектыўная, групавая або індывідуальная форма працы навучэнцаў, разгортваецца агульнакласнае, міжгрупавое або ўнутрыгрупавое абмеркаванне.

Урок любога тыпу можа быць праведзены з выкарыстаннем электронных сродкаў навучання.

Вядучы метад навучання грамаце – гукавы аналітыка-сінтэтычны.

Змест навучання грамаце прадугледжвае выкарыстанне дзейнасных метадаў навучання, у тым ліку адкрыццё пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка элементарных моўных з’яў, заканамернасцей. У працэсе навучання грамаце неабходна рацыянальнае спалучэнне разнастайных метадаў навучання, як прадуктыўных, так і рэпрадуктыўных: тлумачальна-ілюстрацыйнага (інфармацыйна-рэцэптыўнага), рэпрадуктыўнага, праблемнага выкладання вучэбнага матэрыялу, частковa-пошукавага (эўрыстычнага).

Метады і прыёмы, якія выкарыстоўвае педагагічны работнік на ўроках навучання пісьму, накіраваны на развіццё мелкіх мышцаў рукі, адпрацоўку правільнага напісання літар і іх рацыянальных злучэнняў у словах, рытмічнасці і плаўнасці пісьма, фарміраванне разборлівага, дастаткова прыгожага пісьма, якое з’яўляецца неад’емнай прыметай культуры пісьмовых зносін.

Асноўны метад навучання на занятках па пазакласным чытанні – чытанне-разгляд дзіцячых кніг. У навучэнцаў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

Выбар формаў і метадаў навучання і выхавання пры арганізацыі працы па развіцці маўлення вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай вучэбнай тэмы, патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, якія сфармуляваны ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы.

6. Навучанне грамаце накіравана на дасягненне навучэнцамі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў:

6.1. асобасныя: цікавасць да вывучэння беларускай мовы, сфарміраванасць асобаснага сэнсу яе вывучэння і каштоўнасных адносін да мовы; пазітыўныя адносіны да чытання, жаданне самастойна чытаць дзіцячыя кнігі; імкненне авалодаць пісьмом як сродкам зносін, які дазваляе выражаць свае думкі ў пісьмовай форме;

6.2. метапрадметныя: здольнасць да актыўнай творчай дзейнасці ў пазнанні моўных з’яў (дзейсны складнік); валоданне элементарнымі дзеяннямі аналізу, сінтэзу, параўнання, абагульнення, класіфікацыі моўных адзінак (інтэлектуальны складнік); уменне ўстанаўліваць кантакты,

разумець выказванні іншага чалавека і выражаць свае пачуцці, эмоцыі, жаданні, задаваць пытанні, аргументаваць свае меркаванні (камунікатыўны складнік); здольнасць арыентавацца ў такіх крыніцах інфармацыі, як кніга, расказ дарослага або аднагодкаў, схема; прымяняць атрыманую інфармацыю ў сваёй дзейнасці (інфармацыйны складнік);

6.3. прадметныя: валоданне элементарнай тэхнікай чытання і пісьма; валоданне першапачатковымі ўяўленнямі пра лексічныя, арфаэпічныя, граматычныя нормы беларускай мовы, правілы маўленчага этыкету; здольнасць будаваць нескладаныя звязныя выказванні для вырашэння камунікатыўных задач; валоданне ўменнем спісваць невялікі па аб’ёме тэкст, пісаць пад дыктоўку асобныя словы і сказы; валоданне пачатковымі навыкамі сэнсавага чытання тэксту, чытацкай самастойнасці, наяўнасць чытацкага кругагляду – уяўленняў пра творы, іх аўтараў, жанры.

7. Змест вучэбнага прадмета «Навучанне грамаце» структураваны па блоках: навучанне чытанню; навучанне пісьму; пазакласнае чытанне; развіццё маўлення.

У навучанні чытанню і пісьму вылучаюцца перыяды: падрыхтоўчы (дабукварны), асноўны (букварны) і заключны (паслябукварны).

Пазакласнае чытанне праводзіцца адзін раз у два тыдні, займаючы другую частку ўрока чытання.

Праца па развіцці маўлення праводзіцца на кожным уроку навучання грамаце на працягу вучэбнага года.

На вывучэнне асобных раздзелаў зместу вучэбнага прадмета «Навучанне грамаце» даецца прыкладная колькасць гадзін. Педагагічны работнік сам вызначае неабходную колькасць гадзін на кожную тэму, зыходзячы з уласнага вопыту, улічваючы падрыхтаванасць навучэнцаў, умовы іх работы.

8. Для дыягностыкі засваення зместу адукацыі і вызначэння вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбным прадмеце «Навучанне грамаце» рэкамендуюцца наступныя формы кантролю: дыягностыка гатоўнасці да навучання грамаце ў пачатку навучальнага года; вуснае франтальнае апытанне; самастойныя работы па асобных (ключавых) вучэбных тэмах; комплексная работа з тэкстам; праверка навыку чытання; кантрольнае спісванне.

# ГЛАВА 2
# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

## НАВУЧАННЕ ГРАМАЦЕ (180 гадзін)

## НАВУЧАННЕ ЧЫТАННЮ (90 гадзін)

### Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд (12 гадзін)

Агульнае ўяўленне аб вусным і пісьмовым маўленні.

Падзел вуснага маўлення на сказы, фарміраванне элементарных уяўленняў пра сказ (сказ выражае думку, у ім пра кагосьці або пра штосьці гаворыцца). Вызначэнне паслядоўнасці і колькасці слоў у сказе. Складанне сказаў з зададзенай колькасцю слоў па малюнках з апорай на схемы. Адлюстраванне з дапамогай схемы слоўнага складу сказа, яго лінейнасці (словы ідуць адно за адным). Работа над інтанацыяй сказа.

Усведамленне намінатыўнай ролі слова, пашырэнне ўяўленняў пра значэнне слова: словамі называюць прадметы, іх прыметы і дзеянні. Называнне аднаго і таго ж аб’екта рознымі словамі (школьнік, вучань; васілёк, валошка). Засваенне слоў розных тэматычных груп («Радзіма», «сваякі», «школьныя прылады» і іншых груп).

Падзел слоў на склады, вызначэнне колькасці і паслядоўнасці складоў у слове, абазначэнне складовага саставу слова на схеме.

Вылучэнне націскнога склада ў слове. Пашырэнне ўяўленняў пра сэнсаадрознівальную ролю націску (праз параўнанне слоў тыпу ка́са – каса́).

Вылучэнне ў словах асобных гукаў. Падбор слоў з зададзеным гукам. Гукавы аналіз слова (адрозніванне на слых і пры вымаўленні зычных і галосных гукаў, цвёрдых і мяккіх, звонкіх і глухіх зычных).

### Асноўны (букварны) перыяд (61 гадзіна)

Гукавы аналіз слова (вызначэнне паслядоўнасці гукаў у слове, іх характарыстыка – галосны ці зычны; галосны націскны ці ненаціскны; зычны цвёрды ці мяккі, звонкі ці глухі). Вылучэнне ў словах асобных гукаў. Падбор слоў з зададзеным гукам.

Абазначэнне літарамі зычных і галосных гукаў. Правільнае суаднясенне гукаў і літар. Распазнаванне літар па іх характэрных прыметах (ізалявана і ў слове).

Навучанне чытанню прамых складоў «па падабенстве» – са, ла, ма; сі, лі, мі і гэтак далей. Чытанне слоў, сказаў і тэкстаў з вывучанымі літарамі.

Абазначэнне на пісьме мяккасці зычных гукаў літарамі і, я, ю, е, ё, мяккім знакам.

Роля раздзяляльнага ь і апострафа ў словах.

Паступовае навучанне свядомаму, правільнаму і плаўнаму чытанню ўголас і моўчкі асобных слоў, кароткіх сказаў і невялікіх тэкстаў, зразумелых дзецям па змесце.

Практычнае знаёмства са знакамі прыпынку пры чытанні сказаў («.», «!», «?», «,»).

Чытанне сказа з паўзамі і інтанацыямі, адпаведнымі знакам прыпынку.

Засваенне правілаў гігіены чытання.

Заключны (паслябукварны) перыяд (17 гадзін, з іх 1 гадзіна – праверка навыку чытання)

Абагульненне, замацаванне ведаў і ўменняў, набытых у працэсе падрыхтоўчага і асноўнага перыядаў навучання грамаце.

Удасканаленне навыку чытання. Навучанне прыёмам цэласнага чытання слова, плаўнаму, свядомаму чытанню сказа. Развіццё навыкаў асэнсаванага чытання невялікіх твораў розных жанраў (вершаў, апавяданняў, казак, забаўлянак, загадак, прыказак і іншых жанраў).

Развіццё ўмення чытаць тэкст выразна, перадаваць свае адносіны да прачытанага.

Чытанне дыялогаў па асобах.

Інсцэніраванне невялікага знаёмага твора.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі чуем і вымаўляем, літары бачым і чытаем);

усе літары беларускага алфавіта;

асноўныя характарыстыкі гукаў мовы (галосныя і зычныя гукі, зычныя мяккія – цвёрдыя, звонкія – глухія);

спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі е, ё, і, ю, я, ь.

Разумець, што:

мова з’яўляецца асноўным сродкам зносін паміж людзьмі;

беларуская і руская мовы – дзяржаўныя мовы Рэспублікі Беларусь.

Умець:

вычляняць словы ў сказе, гукі ў слове, вызначаць іх паслядоўнасць;

адрозніваць галосныя і зычныя гукі;

правільна вымаўляць мяккія і цвёрдыя зычныя гукі ў слове і ізалявана;

падбіраць словы з зададзеным гукам;

вызначаць месца націску ў слове;

злітна чытаць аднаскладовыя і двухскладовыя словы і плаўна па складах – шматскладовыя;

чытаць невялікія тэксты і вусна расказваць аб прачытаным;

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

самастойна або па пытаннях педагагічнага работніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;

самастойна чытаць друкаваны тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія пісьмы, інфармацыйныя паведамленні).

## НАВУЧАННЕ ПІСЬМУ (90 гадзін)

### Падрыхтоўчы (дабукварны) перыяд (12 гадзін)

Падрыхтоўка рукі дзіцяці да пісьма: расфарбоўка, маляванне ўзораў, абвядзенне па контуры, штрыхоўка ў розных напрамках, напісанне элементаў літар, іх злучэнне.

Выпрацоўка правільнай паставы навучэнца, асваенне правіл размяшчэння сшытка на парце, умення трымаць ручку пры пісьме.

### Асноўны (букварны) перыяд (61 гадзіна)

Абазначэнне гукаў адпаведнымі літарамі друкаванага і рукапіснага шрыфтоў. Знаёмства з напісаннем усіх вялікіх і малых літар, асноўнымі тыпамі іх злучэнняў. Выпрацоўка звязнага і рытмічнага напісання літар і іх злучэнняў у словах, правільнае суаднясенне літар па велічыні, нахіле, раўнамернае размяшчэнне літар і слоў у радку.

Запіс слоў і сказаў з прагаворваннем па складах пасля папярэдняга іх склада-гукавога разбору з педагагічным работнікам, а затым і самастойна.

Засваенне алгарытму спісвання. Спісванне слоў і сказаў з узора (рукапіснага або друкаванага) з арфаграфічным прагаворваннем. Праверка напісанага праз параўнанне з узорам.

Засваенне алгарытму пісьма пад дыктоўку. Пісьмо пад дыктоўку літар, складоў і слоў, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Вялікая літара ў пачатку сказа, кропка ў канцы яго. Вялікая літара ў імёнах і прозвішчах людзей, клічках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр.

Знаходжанне слоў, напісанне якіх разыходзіцца з вымаўленнем (словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі).

Фарміраванне ўмення пераводзіць друкаваны тэкст у рукапісны. Замацаванне і ўдасканаленне прадуктыўных спосабаў чытання слоў і сказаў. Чытанне рукапіснага тэксту.

Заключны (паслябукварны) перыяд (17 гадзін, з іх 1 гадзіна – кантрольнае спісванне)

Удасканальванне навыку пісьма. Захаванне навучэнцамі асноўных гігіенічных патрабаванняў да пісьма. Замацаванне графічна правільных напісанняў літар і спосабаў злучэння іх у слове. Практыкаванні ў рытмічным напісанні літар, складоў, слоў, невялікіх сказаў (з 2–3 слоў).

Удасканальванне ўмення правільна (без пропускаў і перастановак літар і складоў) спісваць невялікія тэксты з рукапіснага і друкаванага ўзору, пісаць словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем.

Перанос слоў па складах.

Практычнае прымяненне правіл правапісу вялікай літары ў імёнах і прозвішчах людзей, клічках жывёл, назвах гарадоў, вёсак, краін, рэк, азёр; афармлення сказаў на пісьме (вялікая літара ў пачатку, кропка ў канцы сказа).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

асноўнае адрозненне гукаў ад літар (гукі чуем і вымаўляем, літары бачым і пішам);

усе літары беларускага алфавіта (рукапісны варыянт);

спосабы абазначэння мяккасці зычных гукаў на пісьме літарамі е, ё, і, ю, я, ь.

Умець:

правільна, без скажэнняў, пісаць вялікія і малыя літары, іх злучэнні ў словах;

правільна спісваць словы і сказы, напісаныя ад рукі і надрукаваныя;

граматна (без пропускаў, скажэнняў літар) пісаць пад дыктоўку словы, напісанне якіх не разыходзіцца з вымаўленнем;

ужываць вялікую літару ў пачатку, кропку ў канцы сказа;

ужываць вялікую літару ў пачатку ўласных імёнаў (імёнаў і прозвішчаў людзей, клічак жывёл, назваў краін, гарадоў, вёсак, рэк і азёр).

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

самастойна падпісваць работу (малюнак, выраб), выкарыстоўваючы вялікую літару для запісу свайго імя;

самастойна складаць і запісваць невялікае паведамленне (1–2 сказы), адрасаванае законным прадстаўнікам непаўналетніх навучэнцаў або сябру;

самастойна чытаць пісьмовы тэкст, адрасаваны дзіцяці (запіскі, невялікія пісьмы, інфармацыйныя паведамленні).

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ

На занятках па пазакласным чытанні ў навучэнцаў фарміруецца цікавасць да дзіцячай кнігі і самастойнага чытання.

Кола чытання. Невялікія мастацкія творы (1–2 старонкі) з дзіцячай кнігі аб'ёмам 10–20 старонак, назва якой, ілюстрацыі на вокладцы і ў тэксце поўнасцю адпавядаюць яе зместу. Дзіцячыя кнігі ў адпаведным афармленні (багата ілюстраваныя, з буйным шрыфтам).

Тэматыка чытання. Творы для чытання педагагічным работнікам услых: аўтарскія і народныя творы розных жанраў (вершы, дзіцячыя песні, казкі, загадкі, прыказкі, апавяданні). Асноўныя тэмы дзіцячага чытання: пра Радзіму, дзяцей, сяброўства, працу, школу, раслінны і жывёльны свет.

Работа з дзіцячай кнігай. Пашырэнне ўяўленняў аб тэматыцы дзіцячых кніг. Знаёмства з новымі кнігамі (адна кніга на кожных занятках); выхаванне цікавасці да дзіцячых кніг, выпрацоўка ўмення адрозніваць кнігі па змесце. Фарміраванне ўменняў правільна называць кнігу (загаловак, прозвішча аўтара), чытаць услых назву дзіцячай кнігі на вокладцы, тлумачыць назву і суадносіць са зместам твора, пазнаваць знаёмыя эпізоды і сітуацыі на ілюстрацыях дзіцячых кніг, называць герояў, узнаўляць змест эпізоду або сітуацыі з апорай на ілюстрацыю, расказваць аб прачытаным.

Выкананне правіл гігіены чытання і захавання кніг.

Удзел у літаратурных гульнях па прачытаных у класе кнігах.

Знаёмства са школьнай бібліятэкай. Выбар кнігі ў бібліятэцы (кніжная выстава, ілюстраваны рэкамендацыйны спіс).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Ведаць:

асноўныя правілы знаёмства з новай кнігай.

Разумець:

неабходнасць выканання правіл гігіены чытання і захавання кніг.

Умець:

правільна называць знаёмыя кнігі, персанажаў любімых казак, апавяданняў;

інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, асобныя эпізоды з твораў.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

самастойна або пры дапамозе дарослых (педагагічнага работніка, бібліятэкара, законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў) выбіраць кнігу па тэме, якая зацікавіла;

самастойна чытаць невялікія па аб'ёме творы з кніг і часопісаў для дзяцей, расказваць аб прачытаным.

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ

Гукавая культура маўлення. Развіццё слыхавой памяці і маўленчага апарату, увагі да гукавога боку мовы (сваёй і чужой). Удасканальванне моўных навыкаў: навучанне нармальнаму тэмпу і рытму маўлення, правільнаму моўнаму дыханню, патрэбнай гучнасці (уменне гаварыць без напружання) і правільнаму інтанаванню (уменне паніжаць і павышаць голас).

Навучанне вымаўленню слоў у адпаведнасці з нормамі арфаэпіі, з захаваннем націску. Правільнае вымаўленне ўсіх гукаў мовы (ізаляванае і ў словах, сказах).

Работа над словам. Удакладненне, узбагачэнне і актывізацыя слоўніка навучэнцаў. Правільнае разуменне і ўжыванне слоў – назваў прадметаў, прымет, дзеянняў. Тлумачэнне іх значэння. Тэматычная групоўка слоў, іх рода-відавое суаднясенне.

Назіранне за сэнсавымі адценнямі слоў (мамачка, сынок, дачушка, сонейка, слонік). Адрозніванне і разуменне самых простых выпадкаў мнагазначнасці слоў (іголка швейная, медыцынская), аманіміі (лісічкі, каса), сінаніміі (жораў, журавель; гожы, прыгожы), антаніміі (мала, шмат; вузкі, шырокі).

Выкарыстанне правільнай граматычнай формы слоў.

Выкарыстанне слоў ветлівасці.

Работа над сказам і звязным маўленнем. Абдумванне адказаў на пытанні педагагічнага работніка, дакладнае іх фармуляванне, ужыванне ў адказе сказаў рознага тыпу.

Пераказ знаёмай казкі ці невялікага апавядання (па пытаннях педагагічнага работніка).

Складанне па малюнку ці серыі малюнкаў невялікага апавядання (пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка).

Адказы на пытанні па прачытаных сказах і тэкстах.

Слоўнае маляванне з дапамогай педагагічнага работніка па змесце прачытанага. Дапаўненне сюжэта, самастойнае прыдумванне падзей, як папярэдніх, так і наступных да адлюстраваных.

Выказванне сваіх уражанняў ад прагледжаных мультфільмаў, тэлеперадач, тэатральных спектакляў, экскурсій, назіранняў.

Адгадванне загадак, тлумачэнне сэнсу прыказак, блізкіх да жыццёвага вопыту навучэнцаў.

Завучванне на памяць вершаў, пацешак, песень, лічылак і ўзнаўленне іх з захаваннем інтанацыі, якая дыктуецца зместам.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Разумець:

важнасць умення правільна гаварыць на беларускай мове, захоўваць правілы маўленчага этыкету.

Умець:

правільна вымаўляць гукі беларускай мовы;

правільна ўжываць у маўленні словы згодна з іх значэннем, выбіраць найбольш прыдатныя словы для выражэння думкі;

карыстацца вобразнымі выразамі (эпітэтамі, параўнаннямі, метафарамі і да таго падобным);

правільна змяняць формы слоў, будаваць сказы розных тыпаў;

самастойна або па пытаннях педагагічнага работніка пераказваць добра знаёмы праслуханы або прачытаны мастацкі твор;

складаць апавяданне па малюнку, серыі малюнкаў, на зададзеную тэму, расказваць пра падзеі з асабістага жыцця;

інсцэніраваць вядомыя літаратурныя творы, асобныя эпізоды з твораў;

ведаць на памяць 4–6 вершаў, выразна іх дэкламаваць.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённых зносінах і ў практычнай дзейнасці:

арфаэпічна правільна вымаўляць словы беларускай мовы;

інтанацыйна выразна афармляць сваё выказванне;

падтрымліваць размову на знаёмую тэму, адбіраючы неабходныя моўныя сродкі для вырашэння пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач (праяўляць разуменне і ўзаемаразуменне, задаваць пытанне, адказваць, выказваць пажаданне, згоду або нязгоду, завяршаць размову).